**І. Ільюшчанка**

# ПРАТЭСТАНЦКАЯ ЦАРКВА І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА БЕЛАРУСКУЮ КУЛЬТУРУ (XVI–XVII стст.)

Рух Рэфармацыі ў ВКЛ адрозніваўся ад яе заходнееўрапейскай плыні тым, што сацыяльная аснова ў ВКЛ была феадальная, а не капіталістычная. Трэба сказаць, што на тэрыторыі ВКЛ існавалі тры напрамкі Рэфармацыі: лютэранства, кальвінізм і антытрынітарызм. Першым у ВКЛ прыйшло лютэранства. Першы лютэранскі сабор з'явіўся ў 1555 г. у Вільні, але з-за сваёй падпарадкаванасці свецкай уладзе яно саступіла кальвінізму, які меў больш рэспубліканскую арганізацыю.

Вялікую ролю пратэстантызм адыграў у сферы адукацыі. Паводле некаторых звестак у канцы XVI ст. на тэрыторыі ВКЛ дзейнічала каля 320 пратэстанцкіх збораў, пры якіх існавалі школы. Яны вучылі дзяцей чытаць, лічыць, а таксама царкоўным спевам, катэхізісу і лацінскай мове.

Існавалі і вышэйшыя школы, але толькі тры праіснавалі досыць доўга. Гэта школы ў Краснабродзе, Паноўцах і Слуцку. Вышэйшыя школы складаліся з чатырох класаў і яны былі ўладкаваны паводле падабенства гімназій. У гэтых школах вывучалі чытанне, пісьмо, лацінскую граматыку, сінтактыку і перакладалі рэлігійныя тэксты. Вышэйшай навучальнай установы ў пратэстантаў не было, што адмоўна ўплывала на жаданне людзей далей знаходзіцца ў гэтай канфесіі.

Пратэстантызм таксама паўплываў на развіццё кнігадруку. Першая друкарня з'явілася ў Берасці ў 1553 г. пры падтрымцы Мікалая Радзівіла Чорнага. Вялікую значнасць мела надрукаваная ў ёй Берасцейская (або Радзівілаўская) Біблія, што з'яўляецца кальвініскім перакладам Свяшчэннага Пісання. Пасля, пры падтрымцы Мікалая Радзвіла Чорнага, друкарня з'явілася і ў Нясвіжы. Ёй кіраваў Сымон Будны. Менавіта ў гэтай друкарні ён надрукаваў дзве свае важныя кнігі – Катэхізіс на старабеларускай мове, і "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам". Акрамя гэтага, у 70-я гг. XVI ст. існавала друкарня Васіля Цяпінскага.

Рэфармацыя адыграла пэўную ролю ў дэмакратызацыі палітычнага жыцця краіны, зацвярджэнні прынцыпаў верацярпімасці. У 1563 г. у Вільні быў выдадзены прывілей Жыгімонта Аўгуста, які быў пацверджаны і пасля гэтага яшчэ пашыраны ў 1568 г. Гэтымі прывілеямі ўся шляхта ВКЛ "веры хрысціянскай" ураўноўвалася ў правах.

Такім чынам, можна казаць, што рух Рэфармацыі – гэта дастаткова неадназначная з'ява ў нашай гісторыі. З аднаго боку, ён выклікаў Контррэфармацыю, якая спрычынілася да паланізацыі беларусаў, але, з другога боку, сама Рэфармацыя спрыяла развіццю культуры і мовы беларусаў, інакш кажучы, грамадскай і этнічнай свядомасці, а таксама і рэлігійнай талерантнасці, ідэям шляхецкай дэмакратыі.